Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 9. Варыянт 2**

## Білет № 9. Практычнае заданне. Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

**Аўтар:**Снытко Ірына Юр'еўна, настаўнік гісторыі ДУА «Сярэдняя школа № 18 г. Віцебска імя В.С.Сметаніна»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Прывядзіце статыстычныя дадзеныя, якія сведчаць пра важкі ўклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй.
2. Суаднясіце прозвішчы ўраджэнцаў Беларусі і іх уклад у перамогу над нацысцкай Германіяй.
3. Як звязана роля БССР у перамозе над фашызмам і яе ўключэнне ў склад заснавальнікаў ААН?
4. Якім чынам у творах літаратуры, кіно і ў сучасных камп'ютарных гульнях увекавечаны подзвіг ураджэнцаў Беларусі (прадстаўленых у крыніцах) на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў?

**Крыніца I**




**Крыніца II**

**Вытрымкі з пратакола паседжання кіраўнікоў дэлегацый Аб'яднаных Нацый 27 красавіка 1945 г.**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

«...Г-н Молатаў кажа, што ён упаўнаважаны зрабіць заявы ад імя ўрадаў Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі…

Важная роля, якую абедзве рэспублікі адыгралі ў барацьбе з агульным ворагам. У гэтых адносінах яны вылучаюцца сярод шаснаццаці рэспублік, таму што, прынамсі, мільён грамадзян кожнай са згаданых рэспублік служыў у шэрагах Чырвонай Арміі. Яны таксама бралі самы актыўны ўдзел у вайне. Германія пачала свой 49 напад на Савецкі Саюз з захопу Украінскай і Беларускай рэспублік, менавіта яны перанеслі самыя цяжкія выпрабаванні, звязаныя з нашэсцем. У заключэнне г-н Молатаў паўтарае сваю прапанову камітэту прыняць рашэнне, ухваленае Крымскай канферэнцыяй, аб уключэнні гэтых двух рэспубалік у лік першапачатковых чальцоў Арганізацыі. ...Заключаючы гэтае пагадненне, прэзідэнт Рузвельт лічыў, што важнае становішча, займанае Украінскай і Беларускай рэспублікамі ў Савецкім Звязе, і пакуты, якія яны перанеслі падчас вайны, роўна як і фундуш, зроблены імі ў агульную справу перамогі, цалкам апраўдваюць іх прыняцце ў Арганізацыю. Таму ён ад імя ўрада Злучаных Штатаў падтрымлівае прапанову, зробленую г-ном Молатавым».

**Крыніца III**
**Воіны-беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны**

| Ураджэнцы Беларусі | | Кароткае апісанне баявой дзейнасці |
|---|---|---|
|  А. М. Усов и З. Г. Колобанов | | Санінструктар, вынесла з поля бою 123 цяжкапараненых байца. Пасля ранення і абмаражэнні засталася без рук і ног. |
|  Г. У. Дольников | | Танкісты. У адным баі пры абароне Ленінграда знішчылі 22 танка суперніка. Адна з самых прэстыжных узнагарод у камп'ютарнай гульні носіць імя аднаго з іх. |

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

| | | |
|---|---|---|
|  П. Купрыянаў | | Лётчык. Вызначыўся ў баях за Дняпро. Пасля тарана фашысцкага самалёта застаўся жывы, патрапіў у палон. З трэцяй спробы збег з палону. Герой Савецкага Саюза. Прататып героя апавядання М. Шолахава «Лёс чалавека» |
|  З.М. Тусналобава-Марчанка | | Радавы. Родам з Жодзіна. Быў малодшым з пяці сыноў у сваёй маці.У баі на тэрыторыі Латвіі зачыніў сваім целам кулямёт ворага. Герой Савецкага Саюза. |

**Адказы:**

**1.**1300 тысяч беларусаў змагаліся ў шэрагах Чырвонай арміі,440 тысяч змагаліся ў шэрагах партызан і падпольшчыкаў, 500 тысяч гітлераўскіх салдат знішчана на тэрыторыі Беларусі,446 воінаў-беларусаў удастоены звання Героя Савецкага, чацвёра з іх - двойчы, звыш 300 узнагароджаны ордэнамі і медалямі, людскія страты склалі каля 2,8-3 млн чалавек, г.зн. загінуў кожны трэці.

**2.**Г. Долнікаў-лётчык, які ў адным з баёў трапіў у варожы палон, але і там захоўваў чалавечую годнасць і веру ў перамогу, пазней з трэцяй спробы збег і працягваў барацьбу з ворагам.

А. Усаў і З. Калабанаў - танкісты, якія змагаліся з ворагам пад Ленінградам. У адным баі знішчалі велізарную колькасць варожых танкаў.

А. Гаравец-лётчык, збіў 9 самалётаў у адным баі падчас Курскай бітвы.

П. Купрыянаў - радавы. У баі на тэрыторыі Латвіі зачыніў сваім целам кулямёт ворага. Герой Савецкага Саюза.

З.М.Тусналобава-Марчанка-санінструктар, вынесла з поля бою 123 цяжкапараненых байца. Пасля ранення і абмаражэння засталася без рук і ног

А.П. Мамкін- у красавіку 1944 г. здзейсніў подзвіг самаахвяравання: вывозіў на самалёце выхаванцаў Полацкага дзіцячага дома, якіх акупанты збіраліся выкарыстоўваць як донараў. Самалёт быў падбіты, але лётчык, які абгарэў да касцей, змог пасадзіць самалёт і выратаваць дзяцей.

3. Доўгія гады акупацыі, масавы ўдзел насельніцтва ў барацьбе з фашызмам і гераізм народа БССР унеслі вялікі ўклад у агульную справу перамогі.
Ацаніўшы гэты ўклад, было прызнана права БССР на ўдзел у стварэнні ААН.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

4.Г. Дольнікаў - апавяданне і фільм "Лёс чалавека", помнікі і мемарыялы, гульня "World of Tanks" - медаль Калабанава (калі збіў 5 танкаў і больш)